# Дайджэст

## ЛГБТ-ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯХ

**Аўтар: GPress.info**

**за III квартал 2021**

Трэці квартал 2021 года магчыма ахарактарызаваць як даволі спакойны ў адносінах асвятлення ЛГБТК+ тэматыкі ў беларускіх медыях.

Нападкі на ЛГБТ-людзей, у тым ліку без дай прычыны, працягваюцца, але пры гэтым не маюць раз’юшанага характару.

Адразу шэраг медыяў даў словы Аляксандра Лукашэнкі пра ЛГБТ, якія былі сказаныя паміж справай. Згодна бачанню Лукашэнкі, ён з'яўляецца «ворагам» для Захаду, бо, маўляў, «ЛГБТ гэта не прызнаю, вясёлкавыя сцягі не выкідваю». Іншых прычынаў для адмоўнага стаўлення да сябе сп-ром Лукашэнкам не акрэсліваецца.

Працягваецца выяўленая намі тэндэнцыя «спускання ўніз» матэрыялаў, якія поўняцца мовай варожасці ў адносінах да ЛГБТ-людзей. Нейкі Леў Браништэйн у матэрыяле «Вясёлкавая прапаганда. Як Захад выкарыстоўвае рух ЛГБТ у палітычных мэтах» развівае тэму пра тое, што «ЛГБТ – выдатнае прыкрыццё для заходніх палітыкаў, калі ім трэба замаскіраваць свае памылкі.»

У прыватнасці, надаецца прыклад прэзідэнта ЗША Біла Клінтана:

«На пачатку прэзідэнцтва Клінтана было цалкам правальным… Натуральна, усе гэтыя праблемы адмоўна сказваліся на рэйтынгу Клінтана, але тым не менш ён прымудрыўся абрацца на другі тэрмін.

А менавіта пры ім пачалася актыўная папулярызацыя свабоды і ўседазволенасці ў грамадстве і, у прыватнасці, ЛГБТ.

Вось такім вось чынам уяўная «барацьба за правы» вырашае важкія палітычныя і часцяком эканамічныя інтарэсы пэўных асобаў або групаў».

Пры гэтым не зазначаецца, што прэзідэнцтва Клінтана было адным з самых паспяховых для эканомікі ЗША. Згодна з логікай аўтара, амерыканцы абралі Клінтана толькі таму, што ён прыхільнік ЛГБТ-каштоўнасцяў…

Гэты матэрыял размясцілі ў сябе на сайтах адразу некалькі раённых газетаў.

Па гэтым жа кірунку «адпрацаваў» прапагандыст Андрэй Мукавозчык.

Такія опусы дэманструюць, што высмейваныя прыёмы т.зв. Захаду па адцягванні ўвагі грамадства ад праблемаў ЛГБТ-тэматыкай, выкарыстоўваюцца больш тапорна самімі беларускімі прапагандыстамі.

Рэдакцыя Gay Press

GPress.info



**Аляксандр Лукашэнка: «Калі я ЛГБТ гэта не прызнаю, вясёлкавыя сцягі не выкідваю, я вораг»**

Аляксандр Лукашэнка: «У Польшчы, на Захадзе няма людзей. Нараджаць жанчыны не хочуць, а зараз жа ўжо лозунг кінулі: сям'я – гэта жанчына з жанчынай, мужык з мужыком. Якія дзеці будуць? Вось вы смеяцеся і правільна робіце. Таму што для нас гэта смешна, а ў іх норма. Вось яны пачуюць маю размову сёння, што я пачынаю іх там, як у нас у народзе кажуць, падколваць, паджартоўваць, троліць, я вораг. Калі я ЛГБТ гэта не прызнаю, вясёлкавыя сцягі не выкідваю – я вораг».




**Дзяржтэлеканалы палохалі мігрантамі і ЛГБТ, цешылі гатоўнасцю да санкцыяў і святамі**

Сярэдзіна лета і дэфіцыт значных навінаў пакінулі след і ў выніковых перадачах 10 і 11 ліпеня на СТВ, «Беларусь-1» і АНТ: давялося «ускрыць» амаль пазабытыя «пужалкі» на тэму мігрантаў і ЛГБТ.



**«Шпанянё задзірае, блатныя глядзяць»**

Аўтарская калонка Андрэя Мукавозчыка: «Уся справа ў тым, што венгры заканадаўча забаранілі прапаганду ЛГБТ-тэматыкі ў сваёй сістэме адукацыі і для сваіх дзяцей. ЕС запатрабаваў гэтыя законы суверэннай дзяржавы змяніць. Нават не буду маракаваць навошта».



## Гаворым пра хатні гвалт пры дапамозе форум-тэатра

Гэтай вясною Цэнтр «Жывая бібліятэка» правёў дзве Майстэрні форум-тэатру «Адчуй правы чалавека» ў межах Тыдня нулявой дыскрымінацыі. Першая – пра правы жанчын – скончылася форум-пастаноўкай пра хатні гвалт і правы маладых жанчын на працы. Другая – пра правы ЛГБТК+ - закранула тэмы дыскрымінацыі ЛГБТ+ людзей на працы і ў навучальных установах, а таксама гвалту ў сям'і.



## Час дзейнічаць: акцыянізм, перфоманс, актывізм. Частка 1

ЛГБТ-актывістка з плакатам «Самі вы падробка» выйшла на адзіночны пікет да будынкаў МУС, КДБ і Дома урада.

Гэта акцыя была рэакцыяй на заяву МУС пра вясёлкавы сцяг над амбасадай Вялікабрытаніі ў падтрымку правоў меншасцяў. Міністэрства тады назвала аднаполыя стасункі падробкай і сказала, што «яны не пройдуць».



## Ці адчыніць «Талібан» для Мінска вакно магчымасцяў?

Заходнія краіны не гатовыя прыняць усіх афганцаў, якія ратуюцца ад талібаў. Напрыклад, Канада заявіла, што можа прыняць 20 тысячаў уцекачоў, але ў першую чаргу гэта будуць прадстаўнікі ЛГБТ-супольнасці.



## «Вясёлкавая прапаганда. Як Захад выкарыстоўвае рух ЛГБТ у палітычных мэтах»

«Але давайце паглядзім, ці не ўшчамляе рэалізацыя правоў ЛГБТ гетэрасексуальных людзей? Чаму гетэрасексуалы не бегаюць па маршах па плошчах з віскатам «Мы – гетэрасексуалы»? Ды проста таму, што на падсвядомым узроўні ўсе ведаюць, што гэта нармальна і так павінна быць.»



## Яўген Алексеюк: год пратэстам у Беларусі, што ў выніку

«Яны [пасланцы заходніх арганізацыяў] – пасланнікі ўсялякага цемрашальства накшталт гендарнай роўнасці, ЛГБТ-прапаганды, разбурэння інстытута традыцыйнай сям'і, перапісвання гісторыі».



## Казімір Вялікаселец: «Адыходзім ад Бога – пачынаюцца рэвалюцыі»

«Хіба гэта нармалёва, калі мужчына з мужчынам? А гэтыя парады! Лесбійкі… У іх такія дэманічныя твары!»



## Белсетка антыСНІД: «Мы заўжды былі патрэбныя дзяржаве»

«Наталля з 2005 года працуе з дзяўчынамі са статусам ВІЧ. У яе такі ж статус. Наталля кажа, што для яе, як лесбійкі, быў вельмі важны той унёсак, які рабіла «Нацыянальная платформа супольнасцяў» у пабудову ўзаемаразумення паміж ключавымі ўразлівымі групамі і зніжэння стыгматызацыі.



**Беларусь уключылі ў рэйтынг небяспечных краінаў для ЛГБТ-турыстаў**

**Рэйтынг бяспечных і небяспечных краінаў для ЛГБТ-турыстаў складаўся на падставе шматлікіх паказчыкаў. У рэйтынгу прадстаўленыя 150 краінаў, Беларусь заняла ў ім 61 месца.**



**Запрашаем на**

**Gay Press!**

**Мы ў сацыяльных сетках:**

**YouTube**

**TikTok**

**Telegram**

**Facebook**

**Instagram**

**ВКонтакте**

**Яндекс.Дзен**

**Twitter**

**E-mail:** GayPresseu@gmail.com

GPress.info

GPress.info